УДК 633.11«324» : 631.527

А. В. МІСКО, І. К. КОПЦІК, В. А. ПЯТУХ

ВЫНІКІ СУПРАЦОЎНІЦТВА ПА СЕЛЕКЦЫІ АЗІМАЙ ПШАНІЦЫ ПАМІЖ БЕЛАРУСКІМ НДІ ЗЕМЛЯРОБСТВА І ІНСТЫТУТАМ СЕЛЕКЦЫІ РАСЛІН У ГЮЛЬЦАЎ-ГЮСТРОВЕ

Павелічэнне ўраджайнасці зерневых культур на сучасным этапе ў вялікай ступені вызначаецца поспехамі селекцыі. Пры інтэнсіўным вядзенні сельскай гаспадаркі роля сорту нязмерна ўзрастае. Вытворчасці патрэбны сарты азімай пшаніцы з высокай ураджайнасцю, якія б ва ўмовах вытворчасці забяспечылі атрыманне 80—100 ц/га збожжа, устойлівыя да палягання, хвароб, з высокай зімаўстойлівасцю і добрымі хлеба-

пякарнымі якасцямі. Дасягнуты ўжо высокі ўзровень ураджайнасці новых сартоў і праблемы ўстойлівасці выклікаюць неабходнасць кааперацыі селекцыйных работ на міжнародным узроўні.

У ГДР паспяхова праводзілася селекцыйная работа па азімай пшаніцы. Сарты азімай пшаніцы селекцыі ГДР: Альцэда, Тарас, Мірас, Алідас, Фактар, Факон і іншыя разам з высокай прадукцыйнасцю валодаюць цэлым комплексам станоўчых прыкмет. Акрамя таго, паўночная зона ГДР, дзе знаходзіцца Інстытут селекцыі раслін у Гюльцаў-Гюстрове, па глебава-кліматычных умовах у значнай ступені адпавядае ўмовам нашай рэспублікі. Усё гэта і забяспечыла магчымасць правядзення сумесных даследаванняў па селекцыі азімай пшаніцы паміж нашым інстытутам і ІСР у Гюльцаў-Гюстрове.

Асноўнай задачай сумесных даследаванняў з'яўлялася стварэнне і вывучэнне новага зыходнага матэрыялу з мэтай атрымання сартоў азімай пшаніцы, якія характарызуюцца высокай прадукцыйнасцю, зімаўстойлівасцю, ранняспеласцю, добрымі хлебапякарнымі якасцямі і высокай устойлівасцю да палягання і асноўных хвароб. Рэалізацыя гэтай задачы выконвалася праз экалагічнае выпрабаванне і ацэнку перспектыўных узораў інстытутаў, абмен калекцыйнымі і селекцыйнымі ўзорамі, правядзенне ўзгодненых камбінацый скрыжаванняў з мэтай стварэння гібрыдных папуляцый з пэўнымі адзнакамі, селекцыі папуляцый з выкарыстаннем прыродных умоў росту.

Пачынаючы з 1983 г. у экалагічным выпрабаванні намі было вывучана 88 сортаўзораў, у селекцыйных гадавальніках — 524 узоры, праведзена селекцыя па 201 гібрыднай камбінацыі. Усяго ў вывучэнні БелНДІЗ знаходзілася 945 сортаўзораў азімай пшаніцы селекцыі ІСР у Гюльцаў-Гюстрове. Столькі ж узораў нашай селекцыі было выслана для вывучэння ва ўмовах ГДР.

Спроба атрымання новых сартоў азімай пшаніцы шляхам простай інтрадукцыі ўзораў ГДР аказалася няўдалай, хоць некаторыя лініі ў асобныя гады і перавышалі стандарт па ўраджаі зерня на 5—8 ц/га (табл. 1). Аднак практычна ўсе сарты ГДР, якія вывучаліся, аказаліся слабазімаўстойлівымі (3—5 балаў па дзевяцібальнай шкале), познаспелымі (на 3—12 дзён пазней за стандарт), з невысокай якасцю зерня. Асабліва вялікім недахопам з'явілася іх познаспеласць, якая ў нашых умовах часта прыводзіла не да фізіялагічнага выспявання, а да падсыхання няспелага зерня, што звычайна паніжала яго масу і якасць.

У той жа час большасць узораў азімай пшаніцы селекцыі ІСР аказаліся высокаўстойлівымі да палягання і многіх хвароб (асабліва да мучністай расы і бурай іржы), вылучаліся шматзёрным прадукцыйным ко-

Табліца 1. **Характарыстыка некаторых узораў азімай пшаніцы селекцыі ГДР**

Назва ўзору	Ураджай зерня, % да стандарта	Перыяд вегетацыі, % да стандарта	Устойлівасць да палягання, бал	Перазімоўка, бал	Ступень пашкоджання	
					мучністай расой	септарыёзам
Бярэзіна—стандарт	100 (53,4 ц/га)	100 (329 дзён)	7	9	5—7	3
Шт. 32050	110	105	9	6	1	1—3
Шт. 32045	108	103	9	6	0—1	1
Шт. 30089	104	102	9	7	1	3—5
Бярэзіна—стандарт	100 (60,5 ц/га)	100 (324 дні)	5—7	9	5—7	5
ТАВ 7.14 925/85	121	102	9	7	0—1	3
ТАВ 7.09 147/86	115	104	9	7	1—3	3
ТАВ 7.14 344/86	114	105	9	6	5	1—3
Мірас	110	100	7	9	1	1—3